УДК [94(476) + 355.231.1(476.7)(091)]«1842/1863»

***Аляксандр Уладзіміравіч Ерашэвіч***
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. эканамічнай гісторыі*
*Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта*
***Aliaksandr Yerashevich***
*Candidate of Historical Sciences (Ph.D in History), Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Economic History*
*of the Belarusian State Economic University*
e-mail: erash06@rambler.ru

# ФІНАНСАВАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ДЗЕЙНАСЦІ БРЭСЦКАГА КАДЭЦКАГА КОРПУСА

*Артыкул прысвечаны фінансававаму забеспячэнню дзейнасці і грашоваму ўтрыманню Брэсцкага кадэцкага корпуса. На аснове разнастайных апублікаваных матэрыялаў і неапублікаваных архіўных дакументаў раскрыты крыніцы фарміравання даходаў, разгледжаны спосабы іх выкарыстання, прыведзены колькасныя паказчыкі, ахарактарызаваны склад і структура выдаткаў Брэсцкага кадэцкага корпуса за ўвесь перыяд яго існавання ў 1842–1863 гг.*

***Ключавыя словы:*** *Расійская імперыя, Брэст, кадэцкія карпусы, даходы, выдаткі, фінансаванне.*

## *Financial Support for the Activities of the Brest Cadet Corps*

*This article is devoted to the financial support of the activities and monetary maintenance of the Brest Cadet Corps. On the basis of the extensive published literature and unpublished archival data, the sources of income formation are disclosed, the ways of their use are considered, the quantitative indicators, composition, and structure of expenses of the Brest Cadet Corps for the period of its existence in 1842–1863 are given.*

***Key words:*** *Russian Empire, Brest, cadet Corps, income, expenses, financing.*

### Уводзіны

Вывучэнне дынамікі працэсу фінансавання розных па прызначэнні дзяржаўных установ і арганізацый перыяду ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі адносіцца да актуальных пытанняў беларускай гістарычнай навукі. У сучаснай беларускай гістарыяграфіі Брэсцкаму кадэцкаму корпусу прысвечаны некалькі навуковых даследаванняў, у якіх уздымаліся асобныя аспекты яго шматграннай гісторыі. У артыкуле С. Я. Куль-Сяльверставай ахарактарызаваны ўмовы навучання і знаходжання ў ім кадэтаў [1]. Нарыс гісторыі гэтай ваенна-навучальнай установы прадстаўлены ў [2], дзе распавядаецца аб падрыхтоўчых мерапрыемствах да адкрыцця Брэсцкага кадэцкага корпуса, разгледжаны яго кадравы афіцэрскі склад, прааналізаваны асаблівасці арганізацыі вучэбнага і выхаваўчага працэсу, прыведзены звесткі аб удзеле кадэтаў у грамадска-палітычным жыцці краю, а яго выпускнікоў у антыўрадавай дзейнасці ў імператарскай Расіі. Тым не менш асобныя аспекты тэмы яшчэ чакаюць больш падрабязных, глыбокіх навуковых даследаванняў з прыцягненнем новых фактычных звестак з разнастайных крыніц, у тым ліку архіўных. Адным словам, айчынныя вучоныя не звярталі належнай увагі на фінансавае забеспячэнне дзейнасці Брэсцкага кадэцкага корпуса, таму гэты аспект навуковай праблемы ўяўляе сёння навуковую цікавасць. Наспела патрэба ў высвятленні механізму фарміравання, напрамках і тэндэнцыях выкарыстання фінансавых сродкаў для стварэння больш поўнага і ўсебаковага ўяўлення аб гісторыі гэтай ваенна-навучальнай установы.

Мэта працы заключаецца ў тым, каб на аснове сістэматызаваных і абагуленых разнастайных апублікаваных і неапублікаваных гістарычных матэрыялаў раскрыць крыніцы фарміравання даходаў, разгледзець спосабы іх выкарыстання, ахарактарызаваць фарміраванне арганізацыйна-штатнай структуры, выявіць колькасць, структуру і дынаміку выдаткаў Брэсцкага кадэцкага корпуса за ўвесь час яго існавання ў 1842–1863 гг.

Для дасягнення мэты выкарыстаны як апублікаваныя нарматыўна-прававыя акты, так і пераважна неапублікаваныя афіцыйна-справаводныя дакументы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мін-

ску і Гродне, Дзяржаўнага гістарычнага архіва Літвы ў Вільнюсе, а таксама разнастайных статыстычных матэрыялаў.

Брэсцкі кадэцкі корпус – гэта сярэдняя ваенна-навучальная ўстанова закрытага тыпу для падрыхтоўкі дзяцей дваран, штаб- і обер-афіцэраў ва ўзросце ад 9 з паловай да 11 з паловай гадоў да ваеннай службы. У розныя гады корпус меў розныя афіцыйныя назвы: Аляксандраўскі Брэсцкі кадэцкі корпус (1842–1859), Аляксандраўскі кадэцкі корпус (25.04.1859–1860), Аляксандраўскі Віленскі кадэцкі корпус (1860–1863) – і месцы свайго размяшчэння. Спачатку корпус знаходзіўся ў Брэсце, але 16.06.1854 г. было прынята рашэнне, згодна з якім пасля абяшчэння Брэст-Літоўскай крэпасці на ваенным становішчы ў сувязі з пачаткам Усходняй (Крымскай) вайны і верагодным ваенным сутыкненнем з Аўстрыяй кадэцкі корпус быў пераведзены ў Маскву, а потым быў перанесены ў Вільню (1861–1863). Брэсцкі кадэцкі корпус быў створаны ў 1842 г., але ў 1863 г. быў расфарміраваны.

**Падрыхтоўка да адкрыцця Брэсцкага кадэцкага корпуса: арганізацыйна-фінансавыя аспекты**

Заснаванне Брэсцкага кадэцкага корпуса не прадугледжвалася папярэднімі планамі ваеннага ведамства. Царскі ўрад і мясцовая грамадская дваранская супольнасць з радавітай знаці і шляхты прыйшлі да кампраміснага рашэння. Дваранства Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці жадала мець сваю ўласную ваенна-вучэбную ўстанову, якая б магла забяспечыць навучанне іх малалетніх дзяцей паблізу ад родных мясцін (адкрыты ў 1835 г. Полацкі кадэцкі корпус знаходзіўся ўдалечыні ад заходніх граніц Расійскай імперыі) і пазбавіць старшых сыноў дваранскіх сем’яў ад неабходнасці цяжкай павіннасці ваеннай службы радавымі з правам выслугі. Расійскі ўрад намагаўся выхаваць з паланізаванай дваранскай моладзі карысных «сыноў Айчыны». Выхаванне ў духу ідэалаў службовага доўгу, адданасці расійскаму трону было магчыма, на думку царскіх чыноўнікаў, толькі ў закрытай ваенна-навучальнай установе. Атрыбуты ваеннай арганізацыі (казарменнае становішча выхаванцаў, падтрымка дысцыпліны, парадку, субардынацыі) былі неабходны, каб ізаляваць будучых кадэтаў ад выхаваўчага ўплыву мясцовага асяроддзя родных і блізкіх людзей (бацькоў, сваякоў, суседзяў, сяброў). Немалаважнае значэнне мела і гатоўнасць мясцовага дваранства да грашовых узносаў, якія былі неабходныя для арганізацыі ваенна-навучальнай установы і дазвалялі сэканоміць дзяржаўныя фінансавыя сродкі.

Падчас наведвання Брэсцкай крэпасці 13–15 жніўня 1840 г. імператар Мікалай I пагадзіўся з задумай стварэння Брэсцкага кадэцкага корпуса пры ўмове яго фінансавання за кошт дваранскіх ахвяраванняў.

У 1840 г. прадстаўнікі дваранства Віленскай губерніі выказалі прапанову, каб кадэцкі корпус, які павінны быў адкрыцца ў Брэст-Літоўску, у выніку адкрыўся ў Вільне і быў бы размешчаны ў будынках скасаванага ўніверсітэта і медыка-хірургічнай акадэміі. Значную ініцыятыву і ролю ў яго арганізацыі праявіў віленскі ваенны губернатар Ф. Я. Міркавіч, які лічыў неабходным адкрыццё Брэсцкага кадэцкага корпуса з мэтай выхавання малалетніх дзяцей мясцовых дваран у духу адданасці расійскаму прастолу ў Вільні ці Брэсце. Пытанне аб заснаванні кадэцкага корпуса было абмеркавана і падтрымана ў 1840 г. на дваранскіх сходах у Мінскай (28 верасня), Віленскай (10 кастрычніка) і Гродзенскай (25 кастрычніка) губернях [3, арк. 9; 4, с. 262].

Фінансаванне дзейнасці новай ваенна-навучальнай установы павінна было забяспечвацца за кошт штогадавых добраахвотных узносаў дваранства, прыпісаных да яго губерняў і Царства Польскага. На надзвычайных сходах дваран Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці ў лютым 1841 г. прадстаўнікі вышэйшага саслоўя бралі на сябе абавязак утрымання 300 кадэтаў, для забеспячэння якіх быў разлічаны штогадовы грашовы збор з уласных даходаў памешчыкаў у памеры па 6 кап. серабром з кожнай рэвізскай душы сялян мужчынскага полу, разлічаны для ўтрымання 313 выхаванцаў у Брэсцкім кадэцкім корпусе [3, арк. 20–20адв.]. Усяго было сабрана 58 914,48 руб. серабром, у тым ліку з Віленскай губерні паступіла 21 792,9 руб., з Мінскай – 20 581,2 руб., з Гродзенскай – 14 611,86 руб., з Беластоцкай вобласці – 1 928,52 руб.

Дваранства Мінскай губерні далучыла да грашовага ахвяравання і працэнты з капіталу ў 3 6724,3 руб. серабром, які быў сабраны раней для 8 выхаванцаў у Полацкім кадэцкім корпусе. Назбіраная дагэтуль дваранствам Мінскай губерні сума была далучана да капіталу Брэсцкага кадэцкага корпуса. Агульны збор з дваранства Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і Беластоцкай вобласці разам з сумай, ахвяраванай дваранствам Мінскай губерні для ўтрымання ў кадэцкім корпусе 8 дадатковых выхаванцаў, склаў больш 60 тыс. руб. серабром [5, с. 237]. Мэтавы фінансавы дваранскі ўзнос быў уключаны ў каштарысы земскіх павіннасцей, а грошы былі накіраваны ў прыказы грамадскай апекі для росту працэнтамі да запатрабавання [6, арк. 40–40адв.]. У далейшым сума з Гродзенскай губерні накіроўваулася ў Брэсцкае павятовае казначэйства, а не ў Гродзенскі прыказ грамадскай апекі, за выключэннем рэштку. Грошы з павятовых казначэйстваў Мінскай губерні высылаліся ў Брэсцкае павятовае казначэйства [7, арк. 39–40].

**Адкрыццё Брэсцкага кадэцкага корпуса, вызначэнне правілаў прыёму выхаванцаў**

Днём заснавання Брэсцкага кадэцкага корпуса лічыцца 16 красавіка 1841 г. – дзень шлюбу цэсарэвіча Аляксандра. Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 30 жніўня 1842 г. Ён размясціўся ў перабудаваным будынку былога бернардзінскага манастыра на Валынскім умацаванні адбудаванай Брэст-Літоўскай крэпасці, але прыём выхаванцаў пачаўся за месяц да афіцыйнага адкрыцця [5, с. 260–266].

Навучэнцы ў кадэцкіх карпусах падзяляліся на казённа-коштных (былі на дзяржаўным забеспячэнні), пансіянераў, стыпендыятаў (вучыліся на кошт збораў дваранскіх супольнасцей, арганізацый і прыватных асоб), сваекоштных вольных слухачоў (утрымліваліся за кошт бацькоў).

У Брэсцкім кадэцкім корпусе было шэраг пансіянераў і стыпендыятаў. Трое выхаванцаў навучаліся за кошт працэнтаў з капіталу памешчыка Іосіфа Матэвуша Ждановіча. Паводле духоўнага тэстамента, складзенага 4 снежня 1842 г. межавым суддзёй Бабруйскага павета І. М. Ждановічам, для выхавання яго сваякоў ці бедных дваран сыноў дачкі Варвары Марцынкевічавай (па мужу Ваяводскай), з мая 1849 г. адлічаліся працэнты з агульнай сумы ў 15 тыс. руб. серабром [8, арк. 17–17адв., 21, 23, 73–73адв.]. Пасля смерці І. М. Ждановіча ахвяраваная яго тэстаментам на карысць Брэсцкага кадэцкага корпуса сума была пацверджана Вышэйшым загадам ад 5 верасня 1853 г. [9, арк. 26–27адв.].

Плата за ўтрыманне малалетніх дваран у кадэцкіх карпусах прыпісаных губерняў вызначалася асобна. Для Аляксандраўскага Брэсцкага кадэцкага корпуса яна складала 220 руб. (Вышэйшы загад ад 27 мая 1847 г.) штогод за кожнага выхаванца. Сваекоштныя пансіянеры губернскіх кадэцкіх карпусоў маглі пераводзіцца на казённае ўтрыманне толькі ў асобных выпадках [10, т. 26-2, № 25623, с. 29].

З 5 лютага 1853 г. рэштка сумы ў 6 000 руб. серабром, якую граф Замойскі ахвяраваў на ўтрыманне скасаванага Шчэбржэшынскага вучылішча ў Царстве Польскім (на кадэцкі корпус было адлічана 5 225,83 руб.), пераводзілася для ўтрымання па аднаму з малалетніх сыноў дваран з Царства Польскага ў Полацкім, Аляксандраўскім Брэсцкім, Уладзімірскім Кіеўскім кадэцкіх карпусах з выплатаю ім па 200 руб. серабром штогод на кожнага выхаванца. Рэштку сумы прадпісвалася захоўваць у Брэсцкім кадэцкім корпусе для назапашвання яе ў аб'ёме, дастатковым за кошт працэнтаў выхоўваць у гэтай ваенна-навучальнай установе яшчэ аднаго дваранскага пансіянера Польшчы [10, т. 28-1, № 26994, с. 43].

Да 1863 г. абавязковая колькасць пансіянераў – дзяцей дваран – у Аляксандраўскім кадэцкім корпусе складала 122 (68 з Мінскай губерні, 54 – з Гродзенскай), а сума на іх утрыманне складала 26 920,58 руб. з разліку 220 руб. за кожнага выхаванца [11, вед. с. 3].

**Фінансавыя крыніцы ўтрымання Брэсцкага кадэцкага корпуса**

Крыніцамі ўтрымання Брэсцкага кадэцкага корпуса былі дваранскія грашовыя ахвяраванні, казённыя сумы, асобныя ўзносы прыватных асоб, сродкі эканамічнага капіталу (рэшткі ад каштарысных асігнаванняў). У 1850 г. на Брэсцкі кадэцкі корпус адпускалася 86 929 руб.: 15 885 руб. (18,3 %) дзяржаўных сродкаў, 71 044 руб. (81,7 %) –

з іншых крыніц даходаў [12, с. 301]. Паводле зацверджанага 24 снежня 1850 г. палажэння Ваеннага Савета, у 1851 г. было прызначана выплаціць на ўтрыманне Брэсцкага кадэцкага корпуса 27 850,56 руб., у тым ліку за кошт працэнтаў з сабранага капіталу на карысць гэтай ваенна-навучальнай установы ў памеры 1 948,95 руб., які захоўваўся ў Гродзенскім прыказе грамадскай апекі, 25 901,61 руб. серабром штогадовых дваранскіх збораў (з Гродзенскай губерні – 11 949,9 руб., з Мінскай – 13 951,71 руб.) [13, арк. 1].

4 снежня 1853 г. было прынята рашэнне і прызнана, каб для прадухілення затрымак асігнаваныя для выдачы Аляксандраўскаму Брэсцкаму корпусу працэнты з капіталу і сумы графа Замойскага, якія захоўваліся ў мясцовых прыказах грамадскай апекі, паступалі для Брэсцкага кадэцкага корпуса з Маскоўскага павятовага казначэйства з наступным іх зваротам у Гродзенскае павятовае казначэйства з мясцовага прыказа грамадскай апекі. Паводле зацверджанага 2 снежня 1854 г. палажэння Ваеннага Савета, на ўтрыманне ў 1855 г. Аляксандраўскага Брэсцкага кадэцкага корпуса былі прызначаны для выдачы з Гродзенскага прыказа грамадскай апекі працэнты з капіталу кадэцкага корпуса 34 525,08 руб., у кошт якіх былі асігнаваны для выдачы 2 623,47 руб. Яго аснову склалі 6 000 руб., перададзеныя графам Замойскім на ўтрыманне Шчэбржэ-шынскага вучылішча ў Царстве Польскім, і 25 901,61 руб. дваранскіх ахвяраванняў: 11 949,9 руб. з Гродзенскай губерні і 13 951,71 руб. з часткі Мінскай [14, с. 43–44].

### Нядоімкі дваранскага збору на карысць Брэсцкага кадэцкага корпуса

Першапачаткова назапашаная дваранская ахвяравальная сума для патрэб Брэсцкага кадэцкага корпуса надалей не папаўнялася цалкам і ў належны тэрмін. Па стане на жнівень 1845 г. нядоімка земскага збору Мінскай губерні на Аляксандраўскі Брэсцкі кадэцкі корпус складала 10 423,42 руб. серабром [15, арк. 7, 10, 13]. На 1 кастрычніка 1855 г. недабор 6-капеечнага збору дваранства Гродзенскай губерні дасягаў 10 495,26 руб. [13, арк. 180–180адв.]. Аклад 1858 г. збору з Мінскай губерні на ўтрыманне Брэсцкага і Полацкага кадэцкіх карпусоў складаў 18 439,2 руб. з дадаткам 3 870,69 руб. запазычанасці [16, арк. 61].

### Змены ў арганізацыйна-штатнай структуры Брэсцкага кадэцкага корпуса і памерах утрымання

Вышэйшы загад, выдадзены ў лютым 1842 г., вызначаў праекты часовага палажэння, штату і табелі Брэсцкага кадэцкага корпуса. Па ўзоры Наўгародскага графа Аракчэева кадэцкага корпуса ён меркаваўся на два гады.

Штогадавое ўтрыманне 400 выхаванцаў павінна было каштаваць 86 331,7 руб. серабром і пакрывацца за кошт дваранскіх ахвяраванняў і казённых сум. Потым тэрмін дзеяння часовых штатаў быў працягнуты да 1849 г. [10, т. 23-1, № 22676, с. 656–657; 5, с. 258–259].

Брэсцкі кадэцкі корпус уключаў пяць рот (грэнадзёрскую, дзве мушкецёрскія ранжыраваныя, неранжыраваную, служыцельскую). Кожная ранжыраваная і неранжыраваная рота мела ротнага камандзіра, капітана, штабс-капітана, трох паручнікаў, фельдфебеля, 9 унтэр-афіцэраў і 100 кадэтаў.

Склад служыцельскай роты быў такі: ротны камандзір, яго памочнік, обер-афіцэр, фельдфебель, «каптэнармус» (захоўванне і выдача маёмасці і харчавання), 10 унтэр-афіцэраў, 160 радавых, 16 «дзядзькаў» з ліку заслужаных адстаўных ці бестэрміноваадпускных ніжніх чыноў. Яна камплектавалася з рэкрутаў і непрыгодных да страявой службы. Уводзілася 40 штатных кадэтаў, уключаючы 4 фельдфебеляў і 36 радавых.

Неабходную суму для ўтрымання, за выключэннем адлічэнняў на выдачу заробку штаб- і обер-афіцэрам, медыцынскім і ніжнім ваенным чынам з Камісарыята, было прадпісана асігнаваць згодна з распараджэннямі Дэпартамента ваенных пасяленняў за кошт штогадавых ахвяраванняў прыпісаных да кадэцкага корпуса губерняў і вобласці, а таксама з працэнтаў з раней сабранага дваранствам Мінскай губерні капіталу і з сум Царства Польскага, штогод прызначаных для ўтрымання корпуса [10, т. 22-2, к № 21372, с. 238, 239, 241].

Паводле імяннога ўказу ад 5 лютага 1853 г. штаты Аляксандраўскага Брэсцкага кадэцкага корпуса сталі такімі, як і штаты 2-га Маскоўскага і Аляксандрынскага сіроцкага кадэцкіх карпусоў [10, т. 28-1,

№ 26994, с. 43]. Разлік сумы, прызначанай на ўтрыманне чыноў Александрынскага сіроцкага кадэцкага корпуса, сведчыць, што на гадавое ўтрыманне Аляксандраўскага Брэсцкага кадэцкага корпуса павінна было выдавацца 144 тыс. руб. З гэтай штатнай сумы ўтрыманне службовых чыноў павінна было каштаваць 48 тыс. руб. (33,3 %), а на забеспячэнне кадэтаў, прыслугі, утрыманне будынка належыла адпускаць 96 тыс. руб. (66,7 %).

**Склад і структура штатнага ўтрымання Брэсцкага кадэцкага корпуса**

Згодна са штатным раскладам Аляксандраўскага Брэсцкага кадэцкага корпуса 1842 г. дырэктару-генералу плацілі 838,5 руб. заробку і 1 401 руб. сталовых, разам 2 239,5 руб. (6,3 %); на вучэбную частку адпускалася 14 514,39 руб. заробку і 560,4 руб. сталовых, разам 15 074,79 руб. (42,6 %); расходы на 45 адміністратараў-выхавальнікаў страявой службы складалі 7 988,55 руб. заробку і 2 661,93 руб. сталовых, разам 10 650,48 руб. (30,1 %); 16 «дзядькам» для нагляду за кадэтамі 1 344,96 руб. заробку і 800 руб. сталовых і на адзенне, разам 2 144,96 руб. (6,1 %); на канцылярыю, уключаючы 15 адміністрацыйна-канцылярскіх работнікаў, разам са справаводнымі выдаткамі – 1 493,37 руб. заробку (4,2 %); 174 ваеннаслужачых служыцельскай роты для ажыццяўлення гаспадарчых работ атрымлівалі 1 471,95 руб. заробку (4,1 %) (разам з абмундзіраваннем – 35 425,88 руб.), 11 медыцынскіх чыноў мелі 1 169,7 руб. заробку (3,3 %); пяць чалавек дапаможнага гаспадарчага персаналу кухні, пральні і пашывачнай мелі 660,21 руб. (1,9 %); чатыры свяшчэнна- і царкоўнаслужыцелі атрымлівалі 443,1 руб. заробку (1,2 %); 38 дзеншчыкоў – 79,8 руб. заробку (0,2 %). Разам для 734 служачых (за выключэннем настаўнікаў) трэба было выплачваць 35 425,88 руб.

На штатных 400 кадэтаў (300 з прыпісаных Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў, Беластоцкай вобласці, Царства Польскага, астатнія 100 вакансій – з унутраных расійскіх і прыбалтыйскіх губерняў) прыходзілася 334 штатных абслуговых асоб службовага персаналу.

Штатныя аклады заробку і сталовых выдаваліся, за выключэннем узаконеных вылікаў на шпіталь, медыкаменты, за павышэнне чыноў, адлічэнняў у пенсійны і інвалідны капіталы. Заробак выкладчыкаў з агульнай штатнай сумы па меркаванні начальства залежаў ад «меры працы, здольнасцей і заслуг кожнага». Усе служачыя па вучэбнай частцы забяспечваліся казёнными кватэрамі ці кватэрнымі грашыма з дзяржаўнага казначэйства. Усе ніжнія чыны, а таксама кадэты акрамя заробку атрымлівалі бясплатна правіянт і абмундзіраванне. Чыны страявога складу мелі грашовае ўтрыманне з Камісарыята.

Асобны роспіс размяркоўваў сумы забеспячэння асоб, якія знаходзіліся ў Брэсцкім кадэцкім корпусе, абмундзіраваннем, амуніцыяй, зброевымі рэчамі, харчаваннем, бытавымі прадметамі. Вылучаліся капіталы для падтрымкі будынкаў і іншых аб’ектаў, для задавальнення гаспадарчых патрэб.

Для харчавання 412 чалавек выдавалася 17 304 руб. (34 %); на забеспячэнне кадэтаў абмундзіраваннем, зброяй, рыштункам, прадметамі быта было прызначана 12 883,64 руб. (25,3 %); на ўтрыманне ў парадку кадэцкага дома, маставой і тратуараў, купальні, лазні і сада было адпушчана 11 720 руб. (23 %); на гаспадарчыя патрэбы (набыццё сталовых прыбораў і рэчаў у пакоях, мыцця бялізны) адпускалі 2 000,4 руб. (3,9 %); для ўладкавання лазарэта на 40 чалавек выдаткоўвалася 1 840,3 руб. (3,6 %); для забеспячэння абмундзіраваннем і рыштункам 20 страявых і 17 нестраявых ніжніх чыноў, 172 чалавек служыцельскай роты, 60 радавых і швейцара ішло 1 798,85 руб. (3,5 %); для набыцця навучальных дапаможнікаў адлічвалася 1 428,6 руб. (2,8 %); на экстраардынарныя расходы пералічвалася 1 000 руб. (2 %); для ўтрымання 14 коней асігнавалася 715 руб. (1,4 %); на ўтрыманне царквы давалі 215 руб. (0,4 %).

З вылічаных 50 905,82 руб. серабром штатных гаспадарчых сум з Камісарыята належала пералічаць 1 798,87 руб. серабром (3,5 %) [10, т. 22-2, к № 21372, с. 241–248].

Усяго з сумы ў 86 331,7 руб. серабром, вызначанай часовымі штатамі для Брэсцкага кадэцкага корпуса, на грашовую падтрымку дзейнасці службовых асоб (персаналу) адпускалася 35 425,88 руб. (41 %), а для іх забеспячэння рознымі рэчамі і для падтрымкі інфраструктуры – 50 905,82 руб. (59 %).

Адзначым, што вакантныя штатныя месцы цалкам не запаўняліся. Па стане на

17 мая 1850 г. у Брэсцкім кадэцкім корпусе было 356 выхаванцаў, у тым ліку 258 пансіянераў (72,5 %) (па 46 з Віленскай і Гродзенскай, 58 – з Мінскай, 48 – з Ковенскай губерняў, 60 – з Царства Польскага), 87 кадэтаў (24,4 %) на дзяржаўным утрыманні і 11 (3,1 %) сваекоштных [17, l. 95–95v].

У 1854 г. у Брэсцкім кадэцкім корпусе з 400 штатных месцаў былі запоўнены 385, а гадавы выдатак на кожнага складаў прыкладна 279,57 руб. [18, с. 90]. У 1861 г. на 383 выхаванцы ў Брэсцкім кадэцкім корпусе прыходзілася 161 869,55 руб. утрымання, ці прыкладна 422,64 руб. на кожнага [19, с. 152].

**Асобныя выплаты на Брэсцкі кадэцкі корпус і іх кампенсацыя**

Пастаянна ўдакладняліся памеры і крыніцы асобных выплат для патрэб Брэсцкага кадэцкага корпуса. Так, на пераезд у Маскву ў 1854 г., які з Брэста ў Маскву заняў больш чым месяц, было выдаткавана 10 тыс. руб. серабром [20, с. 85]. Дваранства Мінскай губерні асігнавала значную суму для прыёму, харчавання і начлегу служачых гэтай ваенна-навучальнай установы [21, с. 166, 167].

Да пераводу Аляксандаўскага кадэцкага корпуса ў 1854 г. у Маскву па табелі для ўтрымання кадэцкіх будынкаў у Брэсце адлічалася 16 715,11 руб., з якіх 9 802,61 руб. (58,6 %) прызначаліся на рамонтныя работы (5 145 руб. пастаянных і 4 657,61 руб. дадаткова атрыманых па загадзе ад 6 лістапада 1851 г.), 5 715 руб. (34,2 %) – на ацяпленне і асвятленне будынкаў і 337,5 руб. (2 %) для ацяплення казематаў, занятых для размяшчэння там чыноў корпуса, 860 руб. (5,1 %) асігнавалася на падтрымку чысціні, пажарных труб, выпраўленне маставой і тратуараў, для ўтрымання лазні, сада і інш.

У Маскве кадэцкія будынкі ўтрымліваліся за кошт інжынернага ведамства, з пераводам яму неабходнай сумы грошай.

У 1860 г., калі кадэцкі корпус быў перамешчаны з Масквы ў Вільню, паводле каштарысу на ўтрыманне будынкаў прадпісвалася вылучыць за другую палову 1860 г. 8 357,555 руб., а на 1861 г. – 1 6715,11 руб. У далейшым дырэктар корпуса генерал-маёр М. К. Баўмгартэн вылічыў патрэбы ра-монту будынкаў у 5 500 руб., іх ацяплення і асвятлення – у 15 500 руб., уладкавання га-радскога вялікага сада – у 800 руб. Агульная сума ўтрымання будынкаў і сада Аляксандраўскага кадэцкага корпуса ў Вільні склала 21 800 руб., і таму на 1862 г., акрамя 16 715,11 руб., было яшчэ дадаткова асігнавана 5 084,89 руб. на кошт рэшткаў сум на ўтрыманне ўпраўлення ваенна-навучальных устаноў.

З 1863 г. сума на падрымку будынкаў і на ўтрыманне сада павялічылася да 21 800 руб. [10, т. 37-1, № 37964, с. 133–134]. Калі кадэтаў размясцілі ў пераабсталяваных будынках Віленскага ваеннага шпіталя, то для ўладкавання новых будынкаў патрабавалася 75 тыс. руб. [2, с. 123].

Частка выкарыстаных сум кампенсавалася з розных крыніц. Так, па загадзе галоўнакамандуючага дзеючай арміі Брэст-Літоўская інжынерная каманда выкарыстала для ўладкавання будынкаў Брэсцкага кадэцкага корпуса з наяўных сум 16 969,52 руб. Гэтая сума ў адпаведнасці з загадам ад 29 лістапада 1841 г. папаўнялася Гродзенскім прыказам грамадскай апекі з капіталаў, ах-вяраваных дваранствам чатырох губерняў. На 1851 г. вылучаная дадатковая сума на ацяпленне і асвятленне будынкаў Брэсц-кага кадэцкага корпуса складала 5 701,49 руб., у тым ліку 4 657,61 руб. было выкарыстана для падтрымкі ўласных будынкаў ваенна-навучальнай установы (кампенсацыя была ўскладзена на дзяржаўнае казначэйства) і 1 043,88 руб. для абслугоўвання памяшкан-няў для размяшчэння чыноў.

9 кастрычніка 1851 г. імператар пераклаў доўг у памеры 16 969,52 руб. з эканамічнага капіталу, прызначанага на ўтрыманне казарм, на кошт звароту з сум дваранскіх збораў чатырох губерняў. У Брэсцкае павятовае казначэйства былі вернуты сумы Дэпартамента ваенных пасяленняў. 5 жніўня 1861 г. імператар распарадзіўся выключыць з рахункаў 16 969,52 руб. [13, арк. 5, 20, 70–70адв., 84, 275].

Пасля прынятага ў Санкт-Пецярбургу 14 мая 1863 г. рашэння аб скасаванні Брэсцкага кадэцкага корпуса, выхаванцы якога ўяўлялі сабою патэнцыяльную пагрозу падтрымкі пратэстаў час паўстання 1863 г. у заходніх губернях, 1 чэрвеня 1863 г. кадэтаў перавялі ў Санкт-Пецярбург, а маёмасць установы распрадалі.

**Заключэнне**

Такім чынам, крыніцамі фарміравання даходаў для ўтрымання Брэсцкага кадэцкага корпуса выступалі не фінансавыя сродкі дзяржаўнага казначэйства, а пераважна дваранскія грашовыя ахвяраванні. Парадаксальна, але ваеннае ведамства імператарскай Расіі дабівалася перавыхавання шляхецкай моладзі ў належным ураду накірунку за кошт дваранскіх грашовых збораў, а не фінансавых рэсурсаў агульнадзяржаўнага казначэйства. Тым не менш дваранская ахвяравальная сума паступала са спазненнем і не ў поўным аб’ёме, таму назапашваліся нядоімкі дваранскага збору на карысць Брэсцкага кадэцкага корпуса. У штатнай структуры ўтрымання Брэсцкага кадэцкага корпуса, як у любой тагачаснай ваеннанавучальнай установе, значная частка грашовых сродкаў вылучалася для ўтрымання абслугоўваючых кадэтаў чыноў дапаможнага адміністрацыйна-страявога, выхаваўчага, гаспадарчага персаналу. З штатнай сумы на грашовае забеспячэнне персаналу адлічвалася прыкладна 41 %, а для набыцця розных рэчаў і для падтрымкі ў належным стане інфраструктуры – 59 %. Штатная колькасць вакансій выхаванцаў цалкам не запаўнялася. Большасць кадэтаў адносілася да катэгорыі пансіянераў (вучыліся за кошт дваранскіх збораў) і толькі каля чвэрці з іх знаходзілася на ўрадавым утрыманні. Для прадухілення затрымак пільна неабходных выплат для фінансавання недкладных патрэб Брэсцкага кадэцкага корпуса ажыццяўляўся перавод грошай і практыкавалася іх выдача з іншых крыніц даходаў з наступным зваротам і кампенсацыяй за кошт земскіх збораў і іншых крыніц.

СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Куль-Сяльверстава, С. Брэсцкі кадэцкі корпус / С. Куль-Сяльверстава // Беларус. гіст. часоп. – 1998. – № 3. – С. 48–53.
2. Бригадин, П. И. Мятежный корпус: из истории Александровского Брестского кадетского корпуса (1842–1863 гг.) / П. И. Бригадин, А. М. Лукашевич. – Минск : ГИУСТ БГУ, 2007. – 182 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 320. Воп. 3. Спр. 77.
4. Федор Яковлевич Миркович. 1789–1866: его жизнеописание, составленное по собственным его запискам, воспоминаниям близких людей и подлинным документам. – СПб. : Воен. импография, 1889. – 6, III. – 424 с.
5. Мельницкий, Н. Н. Сборник сведений о военно-учебных заведениях в России (сухопутного ведомства) : в 4 т. / Н. Н. Мельницкий. – СПб. : Тип. Гл. штаба е. и. в. по воен.-учеб. заведениям, 1857–1860. – Т. 2, ч. 4. – 1857. – 266 с.
6. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 719.
7. НГАБ. – Ф. 333. Воп. 1. Спр. 722 а.
8. НГАБ. – Ф. 299. Воп. 2. Спр. 3488.
9. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 360.
10. Полное собрание законов Российской империи. Собр. 2-е : 1825–1881 гг. : в 55 т. – СПб. : Тип. 2-го отд. собств. е. и. в. канцелярии, 1830–1884.
11. Разная переписка по Министерству народного просвещения в 1862, 1863, 1864 гг. – СПб. : Тип. Императ. акад. наук, 1864. – 989 с.
12. Извлечение из краткого отчета о положении и ходе военно-учебных заведений в 25-летнее царствование Вашего императорского величества 1825–1850 гг. – СПб. : Тип. штаба воен.-учеб. заведений, 1850. – 304 с.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 13. Спр. 1168.
14. Журн. М-ва внутр. дел. – 1855. – № 1. – Отд. 1.
15. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 3. Спр. 92.
16. НГАБ. – Ф. 320. Воп. 1. Спр. 239.
17. Lietuvos valstybės istorios archyvas. – F. 378. Ap. 53, 1845. B. 324.
18. Лалаев, М. С. Исторический очерк военно-учебных заведений, подведомственных Главному их управлению. От основания в России военных школ до исхода первого 25-летия благополучного царствования государя императора Александра Николаевича. 1700–1880 : в 3 ч. / М. С. Лалаев. – СПб. : Тип. М. Стасюлевича, 1880–1892. – Ч. 2 : 1825–1880. – 1880. – 283, 22 с.

19. Сборник историко-статистических материалов по Виленской губернии / ред. М. Гусев. – Вильно : Тип. А. К. Киркора, 1863. – Ч. 1. – IX. – 262 с.

20. Из истории Брестского кадетского корпуса / подг. А. Смирнов // Гіст. брама. – 2002. – № 1–2.

21. Еленский, О. Р. Мои воспоминания о забытом корпусе (Брестский кадетский корпус) / О. Р. Еленский // Рус. старина. – 1895. – Т. 83, № 6. – С. 143–169.

REFERENCES

1. Kul’-Sial’vierstava, S. Brescki kadecki korpus / S. Kul’-Sial’vierstava // Bielarus. hist. chasop. – 1998. – № 3. – S. 48–53.

2. Brigadin, P. I. Miatiezhnyj korpus: iz istorii Alieksandrovskogo Briestskogo kadietskogo korpusa (1842–1863 gg.) / P. I. Brigadin, A. M. Lukashevich. – Minsk : GIUST BGU, 2007. – 182 s.

3. Nacyjanal’ny histarychny arkhiu Bielarusi (NHAB). – F. 320. Vop. 3. Spr. 77.

4. Fiodor Yakovlievich Mirkovich. 1789–1866: jego zhiznieopisanije, sostavliennoje po sobstviennym jego zapiskam, vospominanijam blizkikh liudiej i podlinnym dokumientam. – SPb. : Vojen. impografiya, 1889. – 6, III. – 424 c.

5. Miel’nickij, N. N. Sbornik sviedienij o vojenno-uchiebnykh zaviedienijakh v Rossii (sukhoputnogo viedomstva) : v 4 t. / N. N. Miel’nickij. – SPb. : Tip. Gl. shtaba je. i. v. po vojen.-uchieb. zaviedienijam, 1857–1860. – T. 2, ch. 4. – 1857. – 266 s.

6. NHAB. – F. 333. Vop. 1. Spr. 719.

7. NHAB. – F. 333. Vop. 1. Spr. 722 a.

8. NHAB. – F. 299. Vop. 2. Spr. 3488.

9. NHAB. – F. 320. Vop. 1. Spr. 360.

10. Polnoje sobranije zakonov Rossijskoj impierii. Sobr. 2-je : 1825–1881 gg. : v 55 t. – SPb. : Tip. 2-go otd. sobstv. je. i. v. kanceliarii, 1830–1884.

11. Raznaja pieriepiska po Ministierstvu narodnogo prosvieshchienija v 1862, 1863, 1864 gg. – SPb. : Tip. Imperat. akad. nauk, 1864. – 989 s.

12. Izvliechienije iz kratkogo otchiota o polozhenii i khode vojenno-uchiebnykh zaviedienij v 25-lietnieje carstvovanije Vashego impieratorskogo vielichiestva 1825–1850 gg. – SPb. : Tip. shtaba vojen.-uchieb. zaviedienij, 1850. – 304 s.

13. Nacyjanal’ny histarychny arkhiu Bielarusi u h. Hrodna. – F. 1. Vop. 13. Spr. 1168.

14. Zhurn. M-va vnutr. diel. – 1855. – № 1. – Otd. 1.

15. NHAB. – F. 320. Vop. 3. Spr. 92.

16. NHAB. – F. 320. Vop. 1. Spr. 239.

17. Lietuvos valstybės istorios archyvas. – F. 378. Ap. 53, 1845. B. 324.

18. Lalajev, M. S. Istorichieskij ochierk vojenno-uchiebnykh zaviedienij, podviedomstviennykh Glavnomu ikh upravlieniju. Ot osnovanija v Rossii vojennykh shkol do iskhoda piervogo 25-lietija blagopoluchnogo carstvovanija gosudaria impieratora Alieksandra Nikolajevicha. 1700–1880 : v 3 ch. / M. S. Lalajev. – SPb. : Tip. M. Stasiulievicha, 1880–1892. – Ch. 2 : 1825–1880. – 1880. – 283, 22 s.

19. Sbornik istoriko-statistichieskikh matierialov po Vilienskoj gubiernii / ried. M. Gusiev. – Vil’no : Tip. A. K. Kirkora, 1863. – Ch. 1. – IX. – 262 s.

20. Iz istorii Briestskogo kadietskogo korpusa / podg. A. Smirnov // Hist. brama. – 2002. – № 1–2.

21. Yelienskij, O. R. Moi vospominanija o zabytom korpusie (Briestskij kadietskij korpus) / O. R. Yelienskij // Rus. starina. – 1895. – T. 83, № 6. – S. 143–169.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 05.07.2022*